# [Усьведамленьне выгнаньня як формы жыцьця]

1. Адбылося ўсьведамленьне выгн[аньня] як формы жыцьця і вызначэньне магчымых абсягаў для дзейнасьці нашага „я“ ў гэтым выгн[аньні].

2. Патрэбна пазначэньне канкрэтных задач з гэтых абсягаў для разьвязаньня, для ажыцьцяўленьня „пяцігодкі“, для ператварэньня магчымасьцяй у дзейнасьць. (Пачатак зроблен.)

3. Адбываецца ўсьведамленьне сябе як грамадзкага чалавека (чым станавілася „я“ для іншых) або ўсьведамленьне таго, чым было і стала „я“ ў грамадзе. Усьведамленьне лейтмотыву свайго жыцьця, або ўсьведамл[еньне] сябе для сябе (бог, ідэі — творы і тварэц — чалавек).

4. Ідэя як зброя. Ідэя на службу чалавеку. Чалавек як мэта (усьведамленьне таго, што было, і таго, што ёсьць). Чалавек, якога бракуе Бел[арусі], або адмоўн[ая] рэчаісн[асьць] як грунт утварэньня паняцьця аб патрэбным чалаве[ку] (вызначэньне якасьцяй як зьместу гэтага чалавека). Разьвіцьцё ў сабе пэўных якасьцяй, адпаведных паняцьцю аб патрэбн[ым] чалав[еку], або стварэньне гэтага новага чалавека. Чалавек, які **грае** жыцьцё. Чал[авек] як узор для будуч[ыны]. Чалав[ек], які **ўладае**.

5. Усьведамленьне пераходу па „ўзд[альлі]“ як пераходу ў новы этап у разьвіцьці наш[ага] сьвет[агляду], жыць[ця]разуменьня й жыцьцядзейнасьці (Прыспусьц[іцца] ў даліну з узв[ышша], каб узьняцца „ізноў і вышай“). Праз **далі**ну жыцьц[я].

6. Адбылося першае ўспрыяцьце новай абстаноўкі, новага наўкольля, і апэрцэптуецца цяпер гэта ў зьмест нашага „я“. Мы ўваходзім у яе, а яна ў нас. **Тут людзі** як аб'екты нашага практычн[ага] дасьведчаньня, нашага практыкаваньня, нашага выкрышталізоўваньня. Абст[аноўка], як тачыльны камень. Пасрэднае для непасрэднасьці. Разьвіцьцё сродкаў пасярэднасьці між „я“ і навакольлем (сіла з —).

7. Адрываньне ад прывычнага знаёмага, роднага (сіла з +), адрываньне ад пупавіны, ад глебы. Улада гэтага ўсяго над намі. Вызваленьне з–пад яе для ўлады над ёю і тады ператварэньне адрываньня ў рост, ва ўзвышэньне, у сьпеласьць тэй **„лясной суніцы“**, пра якую пяяў Дуб[оўка] і якая пракоціцца па ўсім сьвеце. („Якая зямля — радзіма гэтакага чалав[ека]?“ — няхай тады пытаюцца людзі.)

8. Адухаўленьне сябе або вызваленьне сябе з таго абмежаваньня, якое носім мы самі з сабою і ў сабе як набытае а ўладнае над намі. Ачышчэньне сябе ад нявіднай „камэры“, якая з намі і ў нас. Зьняцьце ўсяго гэтага паняцьцем аб ім, якое ўвойдзе зьместам у наш сьветагляд. Ачышчэньне поля для змаг[аньня] сіл.

9. Набытае як глеба для росту (Гар[эцкі] і інш.) — гэта тое, на чым расьце новы чалавек. „Я“ як поле дзейнасьці сіл, як поле дыялектыкі. Улада над гэтымі сіламі.

10. „Абжываньне“ як пераход у новы этап нашага жыцьця. Уся зямля як „свая талерка“. Гнуткасьць і „абжываньне“ з найменшай затратай часу. „Абжыцца“ — г. зн. жыцьцём сябе абагаціць, г. зн. набыць правы грамадзянства ў пэўным коле.

11. Актывізацыя сябе ў дачыненьнях з навакольлем. „Я“ як крыніца дух[оўнага] жыцьця для навакольля. „Я“ як арганіз[аваны] пачатак.

*[1931]*